БУДУЧЫНЯ — У АДЗІНСТВЕ НАРОДА

Пра гэта гаварыў Прэзідэнт у выступленні падчас урачыстага сходу ў Палацы Рэспублікі, прымеркаванага да Дня Незалежнасці і 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Урачыстым сходам і канцэртам майстроў мастацтва «Вызваленне» ўвечары 2 ліпеня распачаліся святочныя мерапрыемствы па ўсёй краіне.

Аляксандр Лукашэнка назваў дату вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пунктам адліку новай гісторыі краіны — мірнай і стваральнай, які нават праз доўгія шчаслівыя гады пад чыстым небам нязменна вяртае нас у адзін з самых цяжкіх і гераічных перыядаў жыцця беларускага народа.

Амаль восем дзясяткаў гадоў таму на тэрыторыі Беларусі разгараўся ачаг самай жорсткай у гісторыі чалавецтва вайны. Менавіта на беларускай зямлі фашысцкія захопнікі, прайшоўшы палову Еўропы, упершыню сутыкнуліся з самым лютым супраціўленнем і пацярпелі першыя буйныя страты.

Беларусь страціла ў вайне каля трох мільёнаў чалавек. Калі палічыць і ненароджаных дзяцей, гэтая лічба, па словах кіраўніка дзяржавы, пераверне нашу свядомасць і ўспрыманне страт, якія панесла краіна.

Штогод 3 ліпеня, у Дзень вызвалення Мінска, беларусы перажываюць трагедыю тых гадоў і шануюць герояў, якія абаранілі нашу зямлю. У гэтыя дні сучаснікі схіляюць галовы перад усімі, хто жыццём заплаціў за мірную будучыню.

Прэзідэнт выказаў словы падзякі і брацкім народам — «усім, хто змагаўся за нашы гарады і сёлы, як за сваю малую радзіму, хто вызваляў Беларусь і дапамагаў аднаўляць з руін і попелу ў пасляваенныя гады».

На думку Аляксандра Лукашэнкі, Вялікая Айчынная вайна магла паставіць кропку ў нашай гісторыі, спыніць існаванне беларускага народа. Але ў страшных выпрабаваннях выявіўся нязломны беларускі характар, нацыянальная ментальнасць, якая ніколі не паддавалася рацыянальнаму разуменню тых, хто і раней прыходзіў з мячом на нашу зямлю.

Успомніў у сваім выступленні лідар Беларусі і пра шматлікія дыскусіі на тэму пралікаў, дапушчаных у пачатку Вялікай Айчыннай вайны: «Менавіта на гэтай цяжкай для нас тэме спекулююць і розныя дэструктыўныя сілы ўнутры краіны, але часцей звонку».

Прэзідэнт адзначыў, што нельга дазволіць змясціць акцэнты той эпохі і перакласці адказнасць за ваенныя страты на людзей, якія да апошняга верылі ў сумленнасць дасягнутых палітычных дамоўленасцяў напярэдадні вайны.

«Мы не будзем судзіць мінулае, але будзем здабываць з яго ўрокі. Хай нават жорсткія, непрыемныя ўрокі. Сёння мы дакладна ведаем, што за мір трэба змагацца ў мірны час. Гэта галоўны ўрок, які вынікае з любой вайны, асабліва той вайны. Бачачы, як у сучаснай гісторыі дэвальвуецца сістэма міжнародных адносін, якая склалася, зноў абясцэньваецца чалавечае жыццё, мы павінны абавязкова трымацца разам, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Разам абараняць наш суверэнітэт, змагацца супраць войнаў і канфліктаў сваёй актыўнай пазіцыяй. Не адмоўчвацца, а заклікаць краіны свету да прыняцця адказных рашэнняў, каб пагасіць усе гарачыя кропкі на нашай планеце. Калі будзем маўчаць па прынцыпе «наша хата з краю», заўтра гэта ўсё прыйдзе ў наш дом».

Не мог Прэзідэнт не пракаментаваць гарачыя дыскусіі, якія разгарнуліся наконт законапраекта пра вайсковую службу.

Суверэнітэт і незалежнасць — дарагія рэчы, якія грамадства ўспрыняло «на ўра». І калі паўстала пытанне пра абавязак, пра цану незалежнасці, хоць бы ў частцы абароны суверэнітэту і незалежнасці, мусіруецца думка, што хтосьці павінен выконваць воінскі абавязак, а хтосьці не. Але хто тады будзе абараняць незалежнасць краіны? «Можна звярнуцца ў НАТА, Паўночнаатлантычны блок і папрасіць іх. Калі мы моцна папросім, яны нам паабяцаюць. Вы хочаце гэты варыянт? Я — не. Ёсць іншы варыянт, ён нам бліжэйшы — мы нядаўна ў такім варыянце існавалі, — брацкая, родная нам Расія. Мы можам уступіць у склад Расіі, папрасіць іх, каб яны нас абаранялі, — пералічвае варыянты беларускі лідар. — Вы хочаце ў склад Расіі, каб яна нас абараніла? Не. І я не хачу. Тады застаецца трэці варыянт — самі будзем абараняць сябе».

З амаль 2000 народаў толькі дзясятая частка здолела стварыць уласную дзяржаву. Сярод такіх і наша Беларусь. «І тое, што за чвэрць стагоддзя сваёй незалежнасці ва ўмовах магутнага палітычнага, інфармацыйнага і эканамічнага ціску (памятаеце, зусім нядаўна было) нам удалося абараніць суверэнітэт, захаваць мір і парадак у краіне — стала нашай з вамі агульнай перамогай у найноўшай гісторыі. Перамогай без вайны, што вельмі важна», — канстатаваў кіраўнік краіны.

Памятаючы мінулае, Беларусь вядзе міжнародны дыялог на прынцыпах добрасуседства і ўзаемнай павагі, захоўвае міжканфесійную і ўнутрынацыянальную згоду, імкнецца да справядлівага і гарманічнага развіцця грамадства. Гэтаму навучыла нас гісторыя.

«Мы дакладна ведаем, што будучыня Беларусі ў згуртаванасці народа і нацыянальным адзінстве. Гэта самае вялікае дасягненне нашай дзяржавы і самая лепшая спадчына, якую мы пакінем нашым дзецям і нашым унукам. Мы ганарымся мужнасцю і гераізмам пераможцаў, сваёй працай, поспехамі і мэтамі ў мірным жыцці імкнёмся быць годнымі прадаўжальнікамі іх слаўнага подзвігу. Разам будуем моцную і незалежную дзяржаву. Усё, што зроблена сёння ў Беларусі, нязменна асацыюецца са знакам самай высокай якасці. І гэта дзякуючы вам усім, хто любіць сваю краіну, сумленна працуе ў імя нашай агульнай мэты: зрабіць яе сучасную гісторыю слаўнай і прыгажэйшай. Мы ведаем, што ўсё дасягальнае, але толькі калі будзем верыць ва ўласныя сілы, захаваем мір і зробім усё магчымае ў імя гэтага жыцця на гэтай Зямлі», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Народ Беларусі глядзіць у будучыню і ведае, што яна ёсць, пакуль берагуць памяць пра мінулае. І гэтую памяць увасабляе галоўнае дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці.

Марыя ДАДАЛКА.

ЗЯМЛЯ, ПАЛІТАЯ КРЫВЁЮ

Сумесны праект Полаччыны і газеты «Звязда» «Урочышча Пяскі»

Адкрыццё мемарыяла «Урочышча «Пяскі» запланавана на другі квартал 2020 года

У адным з самых жалобных куткоў полацкай зямлі знайшлі апошні прыстанак амаль 150 тысяч ахвяр фашызму, 38—40 тысяч з якіх былі савецкімі ваеннапалоннымі з перасыльнага лагера «ДУЛАГ-125» у 1941—1944 гадах. Іх забівалі фашысты і тыф, ад якога штодня гінула дзвесце чалавек.

Да нядаўняга часу тут было дзевяць магіл, ледзь прысыпаных пяском. Акт абследавання ад 7 мая 1945 года сведчыць, што дзве магілы захопнікі перад адступленнем спрабавалі спаліць, каб утаіць сляды злачынства. У пасляваенныя гады тут сеялі збожжа, пасвілі коз, пасля была пустка...

«Увекавечыць памяць імкнуліся даўно — грошай не хапала. У 2010 годзе Полацкае аддзяленне Беларускага фонду міру звярнулася ў Полацкі гарадскі Савет дэпутатаў з адпаведнай прапановай, і ўвесь корпус аднагалосна прагаласаваў за тое, што наш абавязак перад загінулымі — стварыць ім помнік», — успамінае **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па заканадаўстве Наталля ГУЙВІК.** Да падтрымкі гэтай ініцыятывы актыўна далучылася і «Звязда».

Фота БелТА.

Кошт праекта мемарыяла склаў мільярд недэмінаваных рублёў, але пасля 2011-га будаўнічыя работы штогод даражэлі. Мемарыял «Урочышча «Пяскі» быў уключаны ў дзяржаўную праграму на 2015—2020 гады, і з дапамогай бюджэтных грошай першая чарга будаўніцтва ўжо здадзена ў эксплуатацыю.

Днём канчатковага адкрыцця мемарыяльнага комплексу ў Полацку можа стаць 9 мая ці 22 чэрвеня 2020 года, паведаміла журналістам падчас вахты памяці ва ўрочышчы «Пяскі» Наталля Гуйвік.

Па яе словах, гатоўнасць мемарыялу цяпер складае амаль 75 %, засталося сабраць каля двухсот тысяч рублёў, каб завяршыць стварэнне комплексу: пабудаваць уваходны партал у выглядзе крыжа і лаўровага вянка, пад'язную дарогу, стаянку, агароджу, дошку з імёнамі ўсіх, хто браў удзел у зборы сродкаў. Да яго, дарэчы, далучыліся не толькі беларусы, як кажуць, усім светам, але і замежжа: зрабілі ўнёсак горад-пабрацім Полацка нямецкі Фрыдрыхсхафен і жыхары Расіі. З'явіцца ў мемарыяле і помнік воінам 1812 года — бо на месцы пахавання ішлі баі і ў XIX стагоддзі: тут знойдзены гузікі салдат той вайны, эмблемы вайсковых злучэнняў.

«Да завяршэння будаўніцтва комплексу падступаліся некалькі разоў, і вось урэшце выходзім на фінішную прамую дзякуючы сумесным намаганням і мясцовай улады, і аблвыканкама, і грамадскіх аб'яднанняў. Сапраўды, праект грандыёзны, і сёння, калі абазначыліся ўжо ягоныя контуры, становіцца лёгка і радасна на душы. Гэта наша памяць, тое, што нас аб'ядноўвае», — адзначыў **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Андрэй ЮНІЦЫН.**

На «генеральнай рэпетыцыі адкрыцця» слёзы выціралі нават мужчыны — настолькі кранула гледачоў тэатралізаваная пастаноўка з лагернай гісторыі. Прадстаўнікі ўлады, грамадскіх аб'яднанняў, вайскоўцы, ветэраны і моладзь усклалі кветкі да помніка, аддаўшы даніну памяці падчас хвіліны маўчання.

«На гэтым месцы асабліва відаць, колькі гора, бяды перанёс наш народ. Перамога палітая крывёю, зямля наша палітая крывёю. Наша задача — данесці нашчадкам памяць пра тое, што тут калісьці было. Работу мы да канца года завершым, зробім добраўпарадкаванне, і тут будуць заўсёды праходзіць мерапрыемствы, будзе збірацца моладзь, уключым мемарыял у маршруты дэлегацый», — паведаміў **старшыня Полацкага райвыканкама, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Мікалай ШАЎЧУК.**

Варвара МАРОЗАВА, *г. Полацк.*

ВІНШАВАННІ З УСЯГО СВЕТУ

Віншаванні з Днём Незалежнасці Беларусі паступілі ў адрас кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі і беларускага народа ад кіраўнікоў замежных краін, замежных палітычных і грамадскіх дзеячаў, кіраўніцтва інтэграцыйных аб'яднанняў, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Віншавальныя пасланні атрыманы ад Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі, прэзідэнтаў Расіі, Казахстана, Азербайджана, Сербіі, Украіны, Таджыкістана, Узбекістана, Турцыі, Венесуэлы, Германіі, Францыі, Рэспублікі Карэя, Аўстрыі, Латвіі, Балгарыі, Венгрыі, ААЭ, Туркменістана, В'етнама, Сінгапура, Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, Дзяржавы Палесціна, Старшыні Дзяржаўнага савета і Савета Міністраў Рэспублікі Куба, прэм'ер-міністраў Расіі і Арменіі, Папы Рымскага Францыска, Каралевы Вялікабрытаніі, каралёў Бельгіі і Тайланда.

«Нашы народы свята шануюць памяць аб мужнасці і гераізме тых, хто ў суровыя ваенныя гады стаў на абарону Айчыны. Важна, што сувязі брацкай дружбы і ўзаемадапамогі, завешчаныя бацькамі і дзядамі, і сёння з'яўляюцца залогам трываласці расійска-беларускіх адносін, — гаворыцца ў віншаванні ад Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна. — Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі

Фота БелТА.

мы будзем і надалей паспяхова развіваць канструктыўнае двухбаковае супрацоўніцтва ва ўсіх сферах, а таксама ўзаемавыгадныя інтэграцыйныя працэсы ў рамках Саюзнай дзяржавы і на еўразійскай прасторы».

«У апошнія гады дзякуючы вашаму цвёрдаму кіраўніцтву ў Беларусі захоўваюцца палітычная стабільнасць, устойлівае развіццё эканомікі, умацоўваецца дабрабыт народа. Агульная моц дзяржавы і яе ўплыў на міжнароднай арэне бесперапынна растуць. Кітай як добры сябар і добры партнёр Беларусі шчыра рады гэтаму. Упэўнены, Беларусь дасягне яшчэ большых поспехаў у розных сферах дзяржаўнага будаўніцтва», — гаворыцца ў віншаванні, якое накіраваў Старшыня КНР Сі Цзіньпін.

«Народы Украіны і Беларусі заўсёды звязвалі ўзаемавыгадныя добрасуседскія і партнёрскія адносіны, далейшаму развіццю і ўмацаванню якіх Украіна заўсёды будзе надаваць прыярытэтнае значэнне. Упэўнены, што гэтаму будуць спрыяць нашы сумесныя намаганні і канструктыўны палітычны дыялог, у тым ліку падчас II Форуму рэгіёнаў Украіны і Беларусі восенню гэтага года», — гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага.

Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон у віншавальным пасланні Прэзідэнту Беларусі адзначыў, што 2019 год характарызуецца працягам інтэнсіфікацыі двухбаковых адносін паміж дзвюма краінамі ў палітычнай, эканамічнай і парламенцкай сферах. «Будзьце ўпэўненыя, што Францыя выступае за паглыбленне дыялогу з суседнімі дзяржавамі Еўрапейскага саюза ў мэтах садзейнічання лепшаму разуменню нашых узаемных палітычных кірункаў», — падкрэсліў ён.

«Малю Госпада пра дараванне беларускаму народу брацкай згоды і салідарнасці, у якіх кожны будзе мець магчымасць дасягнуць поўнага росквіту ўсіх граняў сваёй асобы, у тым ліку духоўнай. Хай блаславіць і захавае Бог вас, вашых паплечнікаў і ўсіх беларусаў», — гаворыцца ў віншаванні Папы Рымскага Францыска.